ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць восьмага склікання

## Справаздача па выніках назірання за рэгістрацыяй ініцыятыўных груп грамадзян

*Назіранне ажыццяўляецца РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У назіранні ўдзельнічаюць 29 доўгатэрміновых назіральнікаў у абласных цэнтрах і найбуйнейшых гарадах Беларусі.*

## АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ

- Адным са спосабаў вылучэння кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў з'яўляецца вылучэнне шляхам збору подпісаў, а рэгістрацыя ініцыятыўных груп з'яўляецца першым крокам перад пачаткам збору подпісаў.
- Паводле дадзеных ЦВК[1], зарэгістраваны 17 542 ініцыятыўныя групы, што складае 99,9% ад агульнай колькасці вылучаных. На папярэдніх выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў у 2014 г. працэнт рэгістрацыі складаў 99,7%.
- Выбарчыя камісіі не стваралі значных перашкод для рэгістрацыі ініцыятыўных груп, амаль усе ініцыятыўныя групы былі зарэгістраваныя. Варта адзначыць, што былі зарэгістраваныя ўсе ініцыятыўныя групы па вылучэнні сябраў палітычных партый.

## І. ПРАВАВАЯ БАЗА

У адпаведнасці з арт. 60 ВК права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў належыць палітычным партыям, працоўным калектывам і грамадзянам шляхам збору подпісаў. Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў могуць быць вылучаны грамадзяне, якія пражываюць ці працуюць на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, а таксама працуючыя ў арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі іншага мясцовага Савета дэпутатаў, але звязаных з задавальненнем патрэбаў насельніцтва і сацыяльным развіццём тэрыторыі дадзенага мясцовага Савета дэпутатаў.

Вылучэнне кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў ажыццяўляецца групай выбаршчыкаў (ініцыятыўнай групай) у колькасці ад 3 да 10 чалавек (арт. 65 ВК).

Згодна з арт. 65 ВК для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, у адпаведную акруговую, тэрытарыяльную выбарчую камісію па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў прадстаўляецца:

---

[1] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS27-sved16.pdf.

пісьмовая заява з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, даты нараджэння, пасады (занятка), месца працы і месца жыхарства, партыйнасці асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты;

копіі старонак пашпарта, якія пацвярджаюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь і рэгістрацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты;

спіс сябраў ініцыятыўнай групы, у якім ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У спісе таксама ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у дэпутаты. Спіс членаў ініцыятыўнай групы прадстаўляецца ў друкаваным выглядзе.

Згодна з Каляндарным планам[2] прадстаўленне ў адпаведную выбарчую камісію дакументаў аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў павінна адбыцца не пазней за 14 снежня 2017 г. Рэгістрацыя ініцыятыўных груп, выдача адпаведных пасведчанняў і падпісных лістоў павінна адбыцца ў пяцідзённы тэрмін з дня паступлення заявы аб рэгістрацыі.

## II. ПАДАЧА ДАКУМЕНТАЎ АБ РЭГІСТРАЦЫІ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП

Прадстаўленне ў адпаведныя выбарчыя камісіі дакументаў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў адбылося ў адпаведнасці з Каляндарным планам і завершылася 14 снежня.

Паводле дадзеных ЦВК[3], у камісіі паступіла 17 тыс 566 заяў. З асоб, вылучаемых кандыдамі ў дэпутаты шляхам збору подпісаў, 97,4 % складаюць беспартыйныя, і толькі 2,6 % – сябры 12 палітычных партый. У параўнанні з 2014 г. пад час сёлетніх выбараў павялічылася агульная колькасць заяў (на 1 500) і колькасць партыйных асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты (амаль ў 2 разы).




[2] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-post32.pdf.
[3] Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-elect_14-15.pdf.

З палітычных партый найбольшую актыўнасць у падачы заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп праявілі Камуністычная партыя Беларусі – 41,5 %, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці – 18,5%, Аб'яднаная грамадзянская партыя – 9,4%.




Палітычныя партыі выкарыстоўваюць вылучэнне шляхам збору подпісаў, таму што вылучэнне ад партыі абмежавана неабходнасцю мець зарэгістраваныя арганізацыйныя структуры. Значным матывам вылучэння шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў было і тое, што збор подпісаў дае дадатковую магчымасць камунікацыі з выбаршчыкамі і агітацыі за будучага кандыдата.

## III. РЭГІСТРАЦЫЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП

Рэгістрацыя ініцыятыўных груп і выдача сябрам ініцыятыўных груп пасведчанняў і падпісных лістоў адбылася своечасова. ЦВК паведамляе[4], што 17 542 ініцыятыўныя групы прайшлі рэгістрацыю. Толькі 16 ініцыятыўным групам было адмоўлена ў рэгістрацыі, 7 заяваў былі адкліканыя і 1 заява не разглядалася. Варта адзначыць, усе ініцыятыўныя групы па вылучэнні сябраў палітычных партый былі зарэгістраваныя, адмовы ў рэгістрацыі выносіліся толькі ў адносінах да беспартыйных вылучэнцаў.

У параўнанні з папярэднімі выбарамі колькасць адмоў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп паменшылася больш чым ў 2 разы. Гэта звязана, у тым ліку з тым, што падчас мінулых выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў ВК актыўна выкарыстоўвалі ўнесеную ў 2013 г. норму, якая дазваляе вылучацца кандыдатам толькі па адной выбарчай акрузе. Калі вылучэнец падаваў заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па некалькіх акругах, АВК прымалі рашэнні аб адмове ў рэгістрацыі ўсіх яго ініцыятыўных груп.

Падчас сёлетняй кампаніі выпадкаў адмоў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп па прычыне падачы заяваў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па некалькіх акругах, падчас дадзенай выбарчай кампаніі не зафіксавана.

Такім чынам, у агульнай колькасці зарэгістраваных ініцыятыўных груп 2,6% складаюць ініцыятыўныя групы па вылучэнні партыйных кандыдатаў і 97,4% - беспартыйных.

[4] Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-elect_18-19.pdf.




Назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» сведчаць, што ВК пераважна не стваралі перашкод для рэгістрацыі ініцыятыўных груп.

У некалькіх выпадках у рэгістрацыі ініцыятыўных груп было адмоўлена з-за судзімасці вылучаемых прадстаўнікоў. Рэчыцкая раённая ВК па гэтай прычыне адмовила ў рэгістрацыі дзвюм групам ад кампаніі «Гавары праўду». Віцебская гарадская выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі адзінай ініцыятыўнай групе – па вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Дзмітрыя Дычэра, таму што ў пададзеных дакументах мелася памылка (у заяве ўказвалася Праўдзінская выбарчая акруга № 48, хаця гарадскіх выбарчых акруг толькі 40).

Паводле назіральнікаў, у рабоце па рэгістрацыі ініцыятыўных груп сустракаюцца факты памылак, як напрыклад, у Аршанскай раённай камісіі[5]. На яе пасяджэнні была зарэгістраваная ініцыятыўная група па вылучэнні кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства «Радуньскае» Святаслава Чэрнікава, які ў заяве аб рэгістрацыі ініцыятыўнай группе абазначыў сваю партыйнасць як «сябра партыі Белая Русь». Толькі пасля таго, як на гэты момант указалі назіральнікі кампаніі «Правабаронцы за свабодныя выбары», камісія звярнула ўвагу, што такой партыі ў краіне не існуе, але не стала мяняць сваё рашэнне, паабяцаўшы разабрацца ў гэтым пытанні.

[5] Даступна на: http://elections2018.spring96.org/be/news/88620.